американцев дистанцироваться и обозначить свою позицию как «равноудаленную» и «незаинтересованную».

**Список использованных источников**

1. *Шаклеина, Т. А.* Концепции внешней политики США после окончания холодной войны: автореф. дис. … д-ра полит. наук: 23.00.04 / Т. А. Шаклеина; Ин-т США и Канады РАН. – М., 2003. – 60 с.

2. Декларация принципов о временных мерах по самоуправлению [Электронный ресурс]. – 1993. – Режим доступа: http://www. middleeast.org.ua /documents/declaration. htm. – Дата доступа: 02.04.2009.

3. *Перес, Ш.* Новый Ближний Восток / Ш. Перес, А. Норие. – М.: Прогресс. Гамма, 1994. – 240 с.

4. *Quandt W. B.* Peace process. American diplomacy and the Arab-Israeli conflict since 1967 / W. B. Quandt. – Third edition. – Washington D. C.: The Brookings Institution and University of California Press, 2005. – 535 p.

5. *Mearsheimer, J. J.* The Israel lobby and U.S. foreign policy / J. J. Mearsheimer, S. M. Walt. – N. Y.: Farrar, Sraus and Giroux, 2007. – 484 p.

6. *Сатановский, Е. Я.* Экономика Израиля в 90-е гг. / Е. Я. Сатановский. – М.: Ин-т изучения Израиля и Ближнего Востока,1999. – 214 с.

7. The Wye River Memorandum [Electronic resource]. – 1998. – Mode of access: http:// www.middleeast.org.ua documents / wyeriver.htm. – Date of access: 13.02.2010.

**(Дата подачи: 20.02.2017 г.)**

*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. Samusik*
Belarus State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)«15/16»**

# ЖАНОЧАЯ АДУКАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

# WOMEN'S EDUCATION IN BELARUSIAN LANDS IN THE MIDDLE OF XVI – FIRST HALF XVII CENTURY

*Артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі праблеме развіцця жаночай адукацыі на беларускіх землях у сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст. На прыкладзе тагачасных прыказак прааналізавана стаўленне айчыннага грамадства да «белагаловых» і вызначаны асноўныя сацыяльныя групы жанчын, якія імкнуліся да ведаў. Паслядоўна вывучаны адносіны да навучання і выхавання дзяўчын у колах пратэстантаў (кальвіністаў, лютэран, арыян), католікаў, праваслаўных і ўніятаў. Разгледжаны асноўныя вучэбныя дапаможнікі, якія найперш арыентаваліся на патрэбы жаночай аўдыторыі. Прасочаны намаганні асобных аўтараў прывіць ёй пачуццё грамадзянскай адказнасці і шчырага патрыятызму.*

*Ключавыя словы: адукацыя; хатняе выхаванне; школы; біблейскія персанажы; жаночыя манастыры; дабрачынная дзейнасць.*

*The scientific article is devoted to undeveloped in the historiography of the problem of women's education in the Belarusian lands in the middle of the XVI – first half XVII century. For example, the then analyzed proverbs ratio of domestic society to «Whitehead» and the main social group of women eager to learn. Consistently studied attitudes to training and education of girls in Protestant circles (Calvinists, Lutherans, Arians), Catholics, Orthodox and Uniate. The basic teaching aids, which are primarily focused on the needs of the female audience. Traces the efforts of individual authors instill her sense of civic responsibility and a sincere patriotism.*

*Key words: education; home training; school; biblical personage; female convents; charitable activity.*

Асветніцкая справа ў Сярэднія вякі і пачатку Новага часу практычна на ўсім абшары еўрапейскага кантынента зыходзіла з так званых «сямі вольных мастацтваў» (граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка), якія ў часы Рэнесансу былі дапоўнены этыкай, гісторыяй і правам. Разам з тым у поўным аб'ёме ўсе яны выкладаліся толькі мужчынскай частцы грамадства, а жанчынам доступ да адукацыі быў у значнай ступені абмежаваны. Першымі ўзнялі пытанне аб неабходнасці пераадолення гэтай традыцыі гуманісты, а ў часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі былі зроблены рэальныя прагрэсіўныя крокі ў дадзеным напрамку. Не абмінуў гэты працэс і Беларусь, спецыфіка якой заключалася ў шматканфесійным складзе яе насельніцтва. Менавіта аналізу стаўлення да жаночай адукацыі пратэстантаў, католікаў, праваслаўных ды ўніятаў і прысвечаны навуковы артыкул, які фактычна ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі комплексна разглядае азначаны напрамак развіцця айчыннай асветы ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст.

Гісторыя жаночай адукацыі бярэ свой пачатак яшчэ ў сярэднявечнай Еўропе ў XIII–XIV стст., калі ў гарадах Францыі, Італіі, Фландрыі і Германіі стыхійна пачалі ўзнікаць пачатковыя школы для дзяўчынак. Прычым на дадзены момант да атрымання ў іх ведаў у першую чаргу імкнуліся прадстаўніцы мяшчанскага саслоўя (дазваляла ім у далейшым уступіць у цэх ці гільдыю), а таксама цыстэрцыянкі, бегінкі і члены іншых манаскіх ордэнаў (неабходна для лепшага выканання царкоўных абавязкаў). Дзяўчыны ж высакароднага паходжання маглі разлічваць выключна на адукацыю ў хатніх умовах, дзе функцыю настаўніц выконвалі маці, старэйшыя сёстры і толькі зрэдку – спецыяльна запрошаныя асобы. Манашкі, дарэчы, нярэдка наведвалі і вучылішчы для свецкай моладзі, бо акцэнт у іх усё роўна рабіўся на рэлігійным выхаванні. Па гэтай жа прычыне гарадскія ўлады ахвотна запрашалі для жаночых школ у якасці настаўніц тых жа бегінак. Пашыранай у Сярэднія вякі была і практыка сумеснага навучання хлопчыкаў і дзяўчынак, што дазваляла магістратам эканоміць на ўтрыманні навучальных устаноў. Выкладалі ж тут пераважна сямейныя пары. У цэлым колькасць асветніцкіх асяродкаў для прадстаўніц слабога полу часам была даволі вялікай. Так, у Парыжы напрыканцы XIII ст. іх існавала ажно 21 [1, с. 293–294].

У сваю чаргу на вялікакняскіх ды каронных землях да жанчын адносіны былі больш кансерватыўнымі. Тут яны, дарэчы, ажно да канца XVIII ст. найменаваліся «белагаловымі», што было звязана з пашыраным тады ў асяроддзі слабога полу белым па колеры галаўным уборы (намітцы). Найперш гэтая назва датычылася замужніх жанчын, але нярэдка такім чынам узгадвалі і дзяўчын на выданні, якіх таксама клікалі «нявестамі». Тагачаснае ж стаўленне айчыннага грамадства да жанчын выдатна зафіксавана ў прыказках: «Грэшная белагаловая ды моцнае віно і з наймудрэйшага зробяць блазна»; «Белагаловая павінна быць набожнай раніцай, у дзень працавітай, мудрай пры накрыцці стала, пяшчотнай у пакоі і заўсёды ахайнай»; «Белагаловая шукае абароны ў плачы, а мужчына ў палашы»; «У белагаловай заўсёды ў галаве вецер»; «Што д'ябал не можа, тое белагаловая зробіць»; «Чатыры рэчы больш за ўсё жадае белагаловая: прыгажосці, дабрабыту, адзення і добрага слова»; «Дзе сыйдзецца тры белагаловых, там ужо кірмаш»; «Тая белагаловая, што чытае, спявае і грае, – наўрад ці будзе дабрачыннай»; «Абяцанкі белагаловай запісаны на паверхні ракі з хуткім цячэннем»; «Лепшы пасаг белагаловай – маўчанне ў час працы і пры размове»; «У белагаловай адзін д'ябл у сэрцы, а другі на скуры»; «У белагаловых доўгія валасы, але кароткія думкі» [2, с. 154–157].

Пры такім падыходзе зусім не дзіўна тое, што нават фактычныя стваральнікі свецкай мадэлі адукацыі ў ВКЛ – пратэстанты – у большасці сваёй не прызнавалі за жанчынамі права на роўнае з мужчынамі навучанне. Тыя ж кальвіністы лічылі, што дзяўчаты павінны атрымліваць пэўныя веды дома пад наглядам бацькоў (найперш маці) і абавязкова вывучыць сімвал веры ды дзесяць запаведзяў. Часам уздымалася гаворка аб неабходнасці чытання імі ўсёй Бібліі, але такая пазіцыя не знайшла шырокай падтрымкі. Грамадства было яшчэ вельмі кансерватыўным і лічыла, што галоўная мэта жаночай асветы – выхаванне ў набожным духу і падрыхтоўка да сямейнага жыцця [3, с. 58]. Доказам жа таго, што асобныя прагрэсіўныя аўтары імкнуліся пашырыць кола сваіх чытачоў за кошт жаночай аўдыторыі з'яўляецца кніга Б. Буднага «Кароткія і сціслыя аповесці, якія па-грэчаскі называюцца Апофегмата» (1599). У цэлым тут давалася гісторыка-павучальная інфармацыя пра 123 славутыя асобы пераважна з антычнай гісторыі. Аднак апошні тутэйшы раздзел распавядаў пра «Белагаловых няглупых» і яўна быў уключаны для належнага выхавання і пашырэння кругагляду жанчын. Першымі тут, дарэчы, ішлі нарысы аб польскіх каралевах Вандзе ды Ядвізе (адзіныя ва ўсёй кнізе айчынныя персанажы), а за імі ўжо прыводзіліся звесткі пра вядомыя постаці з антычнай гісторыі (матка Аляксандра Македонскага Алімпія, каралева Пальміры Зенобія і інш.) [4, с. 121–124].

Падобным чынам ставіліся да выхавання жанчын і арыяне, у асяроддзі якіх, аднак, прадстаўніцы слабога полу (асабліва высокародныя) былі куды больш актыўныя ў грамадскім і царкоўным жыцці – некаторыя на-

ват казалі пропаведзі ў час службаў. Для належнага іх выхавання было выдадзена некалькі прац – найперш тут неабходна назваць твор М. Чаховіца «Люстэрачка паненак хрысціянскіх» (1582). Ён быў напісаны ў выглядзе вучэбнага дапаможніка і дэманстраваў шляхі дасягнення ўзорнага вобраза набожнай прадстаўніцы пратэстанцкай сям'і – паслухмянай, працавітай і здольнай адстойваць уласныя рэлігійныя перакананні нават у форме дыспутаў з іншаверцамі. Дзеля апошняга большая частка кнігі прысвячалася аналізу тэкстаў Св. Пісання ды крытыцы каталіцкай царквы. У цэлым жа ў гэтай кнізе яе аўтар паслядоўна раскрыў абавязкі добрай арыянкі да Бога, бацькоў, а таксама да іншых людзей «прававерных і няверных». Пры гэтым назву свайго твора ён тлумачыў, спасылаючыся на Сакрата, які раіў рэгулярна глядзецца ў люстэрка для лепшага самапазнання [5, с. VI–VII; 7–9; 87–109].

Якасна дапоўніў М. Чаховіца іншы вядомы арыянскі дзеяч Э. Атвіноўскі, які да ўласнай вершаванай працы «Справы альбо гісторыі адметных нявест» (1589) далучыў уласныя разважанні пад назвай «Апісанне набожнай і самавітай жонкі ды добрай гаспадыні». Галоўнай задачай жанчыны тут абвяшчаліся яе абавязкі: паслухмянай жонкі, клапатлівай маці, разважлівай эканомкі і ветлівай гаспадыні ў дачыненні да гасцей. Яна павінна была быць набожнай, шчодрай у адносінах да збяднелых, цярплівай у вядзенні хатняй гаспадаркі. Сярод біблейскіх персанажаў узорамі для пераймання (сярод іншых) аўтар абвяшчаў Сусанну і Юдыф – прыклады этычнай чысціні ды стойкасці характару. Постаць першай з іх з'яўлялася важнай у паводзінах замужніх жанчын – несправядліва абвінавачаная, яна здолела праз уласную дабрачыннасць даказаць сваю вернасць супругу. Другая ж гераіня спакусіла, а затым і забіла вавілонскага палкаводца Алаферна і такім чынам вызваліла свой родны горад ад непрыяцеля. Узгадваў Э. Атвіноўскі і найноўшых англійскіх пратэстантак-мучаніц, пацярпеўшых за веру – А. Эскью (падвергнута катаванням і спалена ў 1546 г. за «ерась») і Дж. Грэй («Каралева дзевяці дзён», звергнутая і пакараная смерцю М. Цюдор у 1554 г.) [6, с. 14–15; 30–32; 7, с. 55–95].

Трэба адзначыць, што подзвіг той жа Юдыфі станоўча каментаваў яшчэ Ф. Скарына, які адзначаў, што яе гераічны ўчынак варты для пераймання ў тым ліку і мужчынамі, бо гэта выдатны ўзор удзелу: «в добрых делех и в любви отчины» [8, с. 45; 155–156]. З пратэстантаў ёй прысвяцілі свае творы апякун Я. А. Каменскага Р. Ляшчынскі (1620) ды В. Патоцкі (1652) [9, с. 18–19].

У сваю чаргу лютаране лічылі, што хатняе навучанне дзяўчат можа прынесці карысць толькі ў заможных сем'ях, якія здольны наняць прыватных настаўніц, а таму неабходна адкрываць і жаночыя школы, разлічаныя на шырокія колы грамадства. М. Лютар на гэты конт пісаў, што неабходна ў кожным горадзе адчыніць школу для дзяўчынак, дзе ім па гадзіне штодзень

чыталі б Евангелле. Добрае ж навучанне не толькі хлопцаў, але і дзяўчат ён тлумачыў, з аднаго боку, неабходнасцю выратавання іх душы, а з іншага – наспеўшай патрэбай удасканалення паўсядзённага жыцця. Пры гэтым, хаця на жанчын найперш М. Лютар ускладваў абавязак выхавання дзяцей і вядзенне хатняй гаспадаркі, славуты дзеяч не адмаўляў ім у праве ведаць мовы, вольныя навукі, літаратуру і гісторыю [10, с. 71; 109–110].

У ВКЛ, аднак, існавалі праблемы з адкрыццём нават мужчынскіх школ, а таму жадаючыя атрымаць адукацыю дзяўчаты былі ўсё ж вымушаны браць пераважна прыватныя ўрокі ў мясцовых пратэстанцкіх міністраў (пастараў) ды настаўнікаў, а таксама іх жонак. Адзіная ж вядомая жаночая школа ў першай палове XVII ст. дзейнічала пры Віленскай лютаранскай абшчыне. Прычым пры абранні сюды настаўніка перавага аддавалася менавіта жанатым асобам, бо ў такім выпадку яго жонка таксама выкладала тут шэраг практычных дысцыплін (дамаводства, рукадзелле і інш.) [11, с. 151; 153].

Стаўленне ж каталіцкай часткі грамадства да жаночай асветы было больш традыцыйным. Шмат хто ўвогуле адмаўляў «белагаловым» у праве на адукацыю і лічыў абавязковым пільны кантроль за іх жыццём з боку мужчын. Прычым адпаведным чынам выказвалі свае думкі нават добра адукаваныя асобы, заваяваўшыя паўсюднае прызнанне дзякуючы сваёй эрудыраванасці і навуковай дзейнасці. Так, прафесар медыцыны Кракаўскага ўніверсітэта С. Петрыцый у працы «Эканоміка арыстоцелеўская альбо хутчэй навука хатняга гаспадарання» (Кракаў, 1601; 1618) катэгарычна заяўляў, што нават дарослыя жанчыны з пункту погляду псіхікі падобны дзецям – ім падабаюцца тыя ж самыя рэчы, у тым ліку: «жарты, аповесці смешныя, спевы, музыка, танцы», а таму неабходны нагляд за іх паводзінамі ды кіраўніцтва [12, с. 66].

Пры гэтым пытанне аб навучанні дзяўчынак у школах нават не ўздымалася, бо лічылася ганебным для іх часта выходзіць з дому і мець зносіны з чужымі людзьмі. Як след гэтага ў каталіцкім асяроддзі дамінавала хатняе выхаванне «белагаловых», дзе на першым месцы стаяла прывіццё паслухмянасці, у тым ліку праз фізічныя пакаранні [13, с. 59–64]. Таксама бацькі павінны былі навучыць сваіх дачок нормам паводзін у сям'і і грамадстве, якія спатрэбяцца ім пасля замужжа. Прычым асабісты прыклад той жа маці тут падмацоўваўся спасылкамі да аўтарытэту царквы. Так, П. Скарга ва ўласным шматтомным творы «Жыццё святых» (Вільна, 1579) шмат увагі звярнуў якраз на выхаванне абвешчаных святымі жанчын. Пры апісанні св. Ефрасінні ён, напрыклад, падкрэсліваў уласцівую ёй «стрыманасць мовы», а св. Кацярыну Сіенскую хваліў за звычку ўжо ў 6-гадовым узросце «маўчанне захоўваць». Узорам для пераймання лічыў аўтар і паводзіны маці св. Макрыны, якая распачала яе навучанне з «мудрасці Саламонавай і псалмоў» ды прывучыла дзяўчыну да штодзённых шматразовых малітваў. Пры гэтым П. Скарга адзначаў, што трывалае ўмацаванне ў веры неабходна яшчэ і на выпадак выхаду замуж за праваслаўнага ці пратэстанта,

бо такім чынам жанчына пазбегне ерэтычных спакусаў і выратуе не толькі ўласную душу, але і сваіх дзяцей [14, с. 16; 48; 375; 675].

Гуманістычны падыход да жанчыны і яе месца ў грамадстве ўласцівы самаму славутаму літаратару эпохі Рэнесанса ў Польшчы Я. Каханоўскаму, які планаваў падрыхтаваць цыкл нарысаў аб славутых прадстаўніцах слабога полу. Прычым апісанне абраных біблейскіх персанажаў ён спрабаваў пацвердзіць адпаведнай інфармацыяй антычных аўтараў (Платон, Плутарх і інш.). На жаль, дадзены твор не быў завершаны, але ў выдадзены пасля смерці Я. Каханоўскага зборнік яго твораў увайшоў трактат «Прыклады пані адважных» з кароткімі апавяданнямі аб 6 асобах (Ева, Хёмара, Арыстоклія, Кама, Тымоклія, Міка). Мэтай аўтара тут быў доказ шляхетнасці жанчын, а таксама іх здольнасці на дабрачыннасць, годнасць, мужныя ўчынкі на карысць Радзімы і ўласнай сям'і. Але перыяд Контррэфармацыі спрыяў захаванню ўсё ж кансерватыўнага светапогляду, а таму яго праца не здолела пахіснуць традыцыйнае стаўленне да месца жанчыны ў грамадстве і яе адукацыйных патрэб [15, с. 132–139].

Неабходна таксама асобна спыніцца на тагачаснай праваслаўнай адукацыі для жанчын. Яе ўздым у апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. зафіксаваў невядомы аўтар палемічнага твора «Ключ царства небеснаго» (1587), пісаўшы, што і некаторыя з «белых галоў» жадаюць ведаць таямніцы «глубокости писма» ды «догмат церковных», хаця, на яго думку, ім бы больш падыйшла б «куделя з веретеном» [16, с. 234]. Станавіліся ў той час прадстаўніцы заможных сямей і фундаркамі буйных асветніцкіх спраў. Так, за кошт адной з апошніх прадстаўніц старадаўняга айчыннага княжацкага роду Н. Ю. Гальшанскай (была замужам за кн. К. І. Заслаўскім) архімандрыт Перасопніцкага манастыра Грыгорый разам з пратапопам Міхаілам Васільевічам пераклалі з балгарскай на простую мову Чацвёра-евангелле (1556–1561 гг.) [17, с. 308].

Аб канкрэтных жа абрысах тагачаснай жаночай асветы сведчыць біяграфія жонкі маршалка мазырскага С. Лозкі Л. В. Гулевіч (Галшкі Гулічоўны). Яе дзед – епіскап луцкі і астрожскі Феадосій – наняў для ўнучкі хатняга настаўніка з ліку выхаванцаў Львоўскай брацкай школы А. Юркоўскага, з якім яна засвоіла асновы царкоўнаславянскай, грэчаскай і лацінскай моў [18, с. 47–48]. Верагодна, выкладаліся дзяўчыне і правілы красамоўства, бо яе даравальная грамата праваслаўнай Кіеўскай брацкай школе (1615) з'яўляецца ўзорам напісання падобнага дакумента [19, с. 385–390].

Закрануў пытанне адукаванасці жанчын і архідыякан Павел Алепскі, які суправаджаў антыяхійскага патрыярха Макарыя, што наведаў у сярэдзіне XVII ст. усходнія землі Рэчы Паспалітай. Ён адзначаў, што большая частка ўбачаных імі мужчын, а таксама іх жонак і дачок умелі чытаць, ведалі парадак царкоўных службаў, малітвы ды рэлігійныя гімны. Агледзеўшы ж Кіеўскі Узнясенскі манастыр, архідыякан пісаў, што там шмат манахінь роз-

нага ўзросту, якія: «Умеют читать, знакомы с философией, логикой и занимаются сочинениями» [20, с. 2; 15; 58: 65].

Што ж датычыцца ўніятаў, то тут заслугоўвае ўвагі праблема асветніцкай дзейнасці жаночых уніяцкіх манастыроў, першым з якіх стаў Пінскі Варварынскі манастыр, прыняўшы ўнію на мяжы XVI–XVII стст. пры ігуменні Е. Трызне [21, арк. 95–98]. Манахіні не мелі статусу асобнага ордэна, але прытрымліваліся правілаў супольнага жыцця св. Васілія, а таму найменаваліся базыльянкамі. Актывізацыі іх дзейнасці істотна паспрыяў І. В. Руцкі. У 1609 г. пры Віленскім Троіцкім манастыры ён арганізаваў падобную жаночую абіцель. Яе настаяцельніцай стала дачка апекуна мясцовага праваслаўнага брацтва Б. Сапегі Варвара, якая пастрыглася ў манахіні пад імём Васілісы пасля смерці мужа старосты канёўскага Р. Валовіча. Фундуш манастыра быў забяспечаны каралём Жыгімонтам III Вазай, які перадаў 8 жніўня 1609 г. сталічным базыльянкам Браслаўскі манастыр: «зо всеми добрами, доходами и пожитками на выхованье свое», а таксама дзядзькай настаяцельніцы канцлерам літоўскім кн. Л. Сапегай, ахвяраваўшым ім м. Дукшышкі [22, с. 53–54]. Гэта дазволіла хутка павялічыць колькасць тутэйшых манахінь, чым і скарыстаўся І. В. Руцкі. Ён пачаў рассылаць іх па буйных гарадах ВКЛ, заснаваўшы, такім чынам, новыя жаночыя манастыры ў Полацку (1621), Навагрудку (1624), Гродна (1626) і г. д. Працягнуў яго справу кіеўскі мітрапаліт А. Сялява, які з дапамогай віленскіх манахінь адкрыў манастыры базыльянак ў Мінску (1641) і Оршы (1642) [23, арк. 9; 24, с. 417; 424; 452, 480; 495]. Школы ў азначаны перыяд пры іх, праўда, не дзейнічалі, але па асабістай дамове з настаяцельніцамі сюды прымаліся дзяўчаты (пераважна са шляхецкіх сямей) для пачатковай адукацыі, прывіцця набожнасці і добрых нораваў [25, с. 239–240].

У сваю чаргу хатняе навучанне дзяўчынак ва ўніяцкім асяроддзі шмат у чым капіравала прыёмы, пашыраныя ў каталіцкай частцы грамадства. Адзіным жа ўніяцкім дапаможнікам, прысвечаным пытанням жаночай асветы, стаў маралізатарскі трактат «Выхаванне сумленнай белай галавы» ўраджэнца Піншчыны Я. Пратасовіча (Пратасевіча), які ў 1597 г. выйшаў у віленскай друкарні  Я. Карцана. Згодна з тагачаснай традыцыяй, тут меліся шматлікія спасылкі на Біблію. Аўтарытэт жа гэтай кнізе прыдавала яе прысвячэнне Кацярыне з роду Лацкіх – жонцы прыняўшага унію ваяводы навагрудскага Ф. І. Скумін-Тышкевіча [26, с. 521–522].

У цэлым відавочна, што менавіта ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст. на тэрыторыі Беларусі адбыліся станоўчыя змены ў дачыненні да жаночай адукацыі. З прычыны перамогі тут кансерватыўнай Контррэфармацыі яны, відавочна, не былі ў стане прывесці да пачатку масавага навучання дзяўчат у школах. Разам з тым выхад цэлагу шэрагу вучэбных дапаможнікаў, разлічаных у тым ліку і на «белагаловых», а таксама рост агульнай колькасці адукаваных жанчын спрыялі ўзмацненню іх ролі ў паўсядзённым і грамадскім жыцці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Опитц, К.* Образование, лечение и забота о здоровье / К. Опитц // История женщин на Западе: в 5 т. / под общ. ред. Ж. Дюби [и др.]. – СПб.: Алетейя, 2005–2015. – Т. 2: Молчание средних веков. 2009. – С. 293–296.

2. Białogłowa // Gloger, Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana: w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Wyd-wo P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. – T. 1. – 1900. – S. 154–157.

3. *Bagińska, E.* Edukacja kaznodziejów ewangelicko-reformowanych na Litwie w XVII wieku / E. Bagińska // Studia Podlaskie. – 2012. – T. XX. – S. 55–74.

4. *Budny, B.* Krotkich a węzlowatych powieśc i ktore po grecku zową Apophthegmata / B. Budny. – Wilno: Druk. J. Karcana, 1599. – 124 s.

5. *Czechowic, M.* Zwierciadłko panienek chrystiańskich ku obejźrzeniu się w powinnościach swych chrystiańskich / M. Czechowic. – Raków: Druk. T. Adamowicza, 1582. – X, 109 s.

6. *Otwinowski, E.* Sprawy abo Historye znacznych niewiast ze wszytkiego prawie pisma świętego dla pamięci krótko zebrane. Przydane są niektóre rzeczy do tegoż należące. O dobrej żenie. O wychowaniu dziatek. O stroiach y o tańcach / E. Otwinowski. – Kraków: Druk. A. Rodeckogo, 1589. – 61 s.

7. *Wilczek, P.* Erazm Otwinowski – pisarz ariański / P. Wilczek. – Katowice: Wyd. Naukowe i Artystyczne «Gnome», 1994. – 169 s.

8. *Скарына, Ф.* Творы: прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.

9. *Bieńkowski, T.* Aspekty edukacji staropolskiej : stanowe modele życia i wzory osobowe / T. Bieńkowski // Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 2002. – T. 41. – S. 7–29.

10. Мартин Лютер – реформатор, проповедник и педагог. Тексты и комментарии / сост. О. В. Курило. – М.: Изд-во РОУ, 1996. – 240 с.

11. *Харлампович, К.* Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань: Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.

12. *Petrycy, S.* Oekonomiki Aristotelesowey, To Iest Rządu Domowego Z dokładem Księgi Dwoie. Powtore wydane, poprawione, y w wielu rzeczach potrzebnych przyczynione, na pożytek y zaostrzenie umysłu / S. Petrycy. – Kraków: Druk. M. Jędrzejowczyka, 1618. – VI, 135 s.

13. *Korczak-Siedlecka, J.* Model wychowania dziewcząt w szesnastowiecznej Polsce / J. Korczak-Siedlecka // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – 2014. – T. 58. – S. 49–71.

14. *Skarga, P.* Zywoty Swiętych starego y nowego zakonu z pisma świętego y z poważnych pisarzow y Doktorow koscielnych wybranych. – Wilno: Druk. J. Ślęckiego, 1579. – 1135 s.

15. *Kochanowski, J.* Wzór pań mężnych / J. Kochanowski // Jan Kochanowski. – Krakow: Druk. Łazarzowej, 1586. – S. 132–139.

16. Архив Юго-Западной России, издаваемый Комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе: в 8 ч.; 35 т. – Киев: Тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, 1859–1914. – Ч. 1. – Т. 7. – 1887. – XVI, 802 с.

17. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / пад рэд. В. Б. Евароўскага [і інш.]. – 2013. – 615 с.

18. *Хижняк, З. І.* Галшка Гулевичівна – фундаторка Києво-Могилянської академії / З. І. Хижняк // Українки в історії / за заг. ред. В. Борисенко. – Київ: Либідь, 2004 – С. 47–51.

19. Памятники, изданные Киевскою комиссиею для разбора древних актов, издание второе, с дополнениями: в 3 т. – Киев: Тип. Имп. ун-та св. Владимира, 1897–1898. – Т. 2. – 1897. – 235 с.

20. Путешествие Антиохийского патриарха Макария в Россию в половине XVII века, описанное его сыном архидиаконом Павлом Алеппским: в 5 вып. / пер. Г. Муркоса. – М.: Универ. тип., 1896–1900. – Вып. 2. – 1897. – 202 с.

21. НГАБ у Гродна. – Фонд 1621: Брэсцкая ўніяцкая кансісторыя. – Воп. 1. – Спр. 5: Інвентарныя апісанні базыльянскіх манастыроў Рэчыцкага, Пінскага, Барысаўскага, Ігуменскага паветаў Мінскай губ. за 1804, 1805, 1811 гг. – 109 арк.

22. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею: в 15 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1863–1892. – Т. 2. – 1865. – 301 с.

23. НГАБ у Гродна. – Фонд 1621: Брэсцкая ўніяцкая кансісторыя. – Воп. 5. – Спр. 4: Інвентарныя апісанні манастыроў Ляшчынскага базыльянскага мужчынскага за 1802 г., Навагрудскага базыльянскага жаночага за 1819 г. – 16 арк. Арк. 9.

24. *Слюнькова, И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси / И. Н. Слюнькова. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.

25. *Суша, А. А.* Отношения между иезуитами и базилианами Великого Княжества Литовского в сфере образования / А. А. Суша // Jėzuitai Lietuvoje (1608–2008): gyvenimas, veikla, paveldas = Jesuits in Lithuania (1608–2008): Life, Work, Heritage / sudarytoja N. Markauskaitė. – Vilnius: Lietuvos nacionalinis muziejus, 2012. – P. 232–244.

26. *Lulewicz, H. P*rotasowicz (Protasewicz) Jan / H. Lulewicz // Polski Słownik biograficzny. – T. XXVIII. – Warszawa-Kraków: Wyd. PAN, 1984–1985. – S. 521–522.

**(Дата падачы: 12.12.2016 г.)**

*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. Sorokovik*
Academy of public administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 378.4(091)(476-25)**

## МІНСКІ ЮРЫДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ: 1944/1945 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

## MINSK LAW INSTITUTE: 1944/1945 ACADEMIC YEAR

*Артыкул прысвечаны аднаўленню працы Мінскага юрыдычнага інстытута ў 1944 г. Тэма практычна не даследавана гістарычнай навукай. Падрыхтаваны на аснове архіўных матэрыялаў, упершыню ўведзеных ў навуковы зварот.*

*Ключавыя словы: Мінск; юрыспрудэнцыя; інстытут; аднаўленне; студэнты; вучэбны працэс; кафедра; выкладанне; дысцыпліны; навуковая дзейнасць.*

*The article is devoted to reconstruction of the Minsk law Institute in 1944. The theme almost not studied by historical science. Prepared on the basis of archival materials, first introduced in the scientific bypass.*

*Key words: Minsk; law; Institute; recovery; students; educational process; Department; teaching; disciplines; scientific research.*

3 ліпеня 1944 г. была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў сталіца Беларускай ССР г. Мінск і ў гэтым жа месяцы пачалася падрыхтоўчая праца па аднаўленні дзейнасці юрыдычнага інстытута ў горадзе – аднаго з першых у рэспубліцы. Гэта сведчыць аб той вялікай увазе вышэйшага саюзнага і рэспубліканскага кіраўніцтва да падрыхтоўкі юрыдычных кадраў.